Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
_________________Ю.П.Бондар
«_____» _____________2011 г.
Рэгістрацыйны № ВД-____/вуч.

# ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВА ЭСТРАДЫ
## Раздзел 1. Гісторыя сусветнага і беларускага эстраднага музычнага мастацтва

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2011

**Складальнік**

*А. В. Шэдава,* дацэнт кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*Т. П. Каралёва,* дацэнт кафедры фартэпіяна ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*Н. І. Дожына,* дацэнт кафедры тэорыі музыкі і музычнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 11 ад 23.03.2011 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 30.06.2011 г.)

Адказны за рэдакцыю *В. В. Каташвілі*

Адказны за выпуск *А. В. Шэдава*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Гісторыя сусветнага і беларускага эстраднага музычнага мастацтва» з'яўляецца першым раздзелам вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя мастацтва эстрады» і знаходзіцца ў цесным узаемадзеянні з іншымі яе раздзеламі – «Гісторыя сусветнага і беларускага джаза», «Гісторыя сусветнага і беларускага эстраднага музычнага тэатра», «Гісторыя сусветнага і беларускага джазавага выканальніцтва», мае дачыненне да дысцыплін «Спецінструмент», «Імправізацыя на спецінструменце», «Вакал», «Вакальны ансамбль», «Аркестравы клас», «Інструментазнаўства, аранжыроўка і пераклад музычных твораў», «Камп'ютарная аранжыроўка» і інш.

Як складнік вучэбнага працэсу прафесійнай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў у сферы мастацтва эстрады адпаведныя звесткі з яго гісторыі істотныя для грунтоўнасці ведаў, фарміравання добрага мастацкага густу, яны шыраць кругагляд будучых спецыялістаў, магчымасці арыентацыі ў з'явах мастацкай рэчаіснасці краіны і свету, а таксама дадаюць тэарэтычнае асэнсаванне ўласнай практычнай дзейнасці.

Асноўная *мэта* дысцыпліны – даць цэласнае ўяўленне аб працэсах, з'явах, тэндэнцыях развіцця сусветнага і беларускага эстраднага музычнага мастацтва.

У працэсе навучання прадугледжана рашэнне наступных *задач:*

– разгледзець асноўныя заканамернасці і этапы развіцця сусветнага эстраднага музычнага мастацтва;

– вызначыць мастацка-эстэтычную спецыфіку, засвоіць моўныя асаблівасці і сродкі выразнасці асноўных жанраў і стылёвых напрамкаў музычный эстрады;

– адзначыць тэндэнцыі і напрамкі развіцця сучаснага эстраднага музычнага мастацтва;

– азнаёміць з творчасцю лепшых выканаўцаў сусветнага і айчыннага эстраднага музычнага мастацтва.

Працэс падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне мастацтва эстрады накіраваны на авалоданне студэнтамі ведамі і ўменнямі, якія дазваляюць ім на належым узроўні вырашаць прафесійныя задачы ў далейшай творчай і педагагічнай дзейнасці, свабодна арыентавацца ў гісторыі і асаблівасцях развіцця сучаснага эстраднага музычнага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнты павінны *ведаць:*

– асноўныя этапы развіцця эстраднага музычнага мастацтва;

– сутнасць, спецыфіку, моўныя асаблівасці і сродкі выразнасці мастацкіх напрамкаў, стыляў і жанраў эстраднага музычнага мастацтва, творчую дзейнасць яго лепшых прадстаўнікоў;

*умець:*

– асэнсоўваць працэсы і з'явы ў эстрадным музычным мастацтве;

– аналізаваць стылёвыя напрамкі эстраднай музыкі;

– ацэньваць мастацкія вартасці твораў і лепшыя індывідуальныя выканальніцкія стылі.

Выкладанне дысцыпліны заснавана на гісторыка-тэарэтычным метадзе, агульна-дыдактычных (камунікатыўны, рэпрадуктыўны, праблемны) і эмпірычных (актыўнае назіранне, гутаркі, знаёмства з аўдыя- і відэаматэрыяламі) метадах. Асобнае значэнне сёння набывае выкарыстанне ўсіх магчымасцей, якія прадастаўляюцца інфармацыйнымі (камп'ютарнымі) і сеткавымі тэхналогіямі.

Для самастойнай работы студэнтам прапануюцца пытанні для семінараў, тэмы рэфератаў, спіс неабходнай літаратуры. Самастойная работа студэнтаў кантралюецца ў працэсе вуснага апытання падчас заняткаў, з дапамогай тэставых заданняў. Таксама асобныя студэнты рыхтуюць даклады па тэмах дысцыпліны для выступлення на навуковых канферэнцыях.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Гісторыя сусветнага і беларускага эстраднага музычнага мастацтва» ўсяго адведзена 40 гадзін, з якіх 26 – аўдыторныя заняткі (12 лекцыі, 14 семінары).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назвы тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | лекцыйныя | семінарскія |
| Уводзіны | 1 | |
| *Тэма 1.* Вытокі і этапы развіцця сусветнага эстраднага музычнага мастацтва (да XIX ст.) | 2 | 1 |
| *Тэма 2.* Этапы развіцця эстраднага музычнага мастацтва (XIX – пачатак XXI ст.) | 1 | 2 |
| *Тэма 3.* Стылёвыя напрамкі папулярнай музыкі XX ст. | 2 | 2 |
| *Тэма 4.* Стылёвыя напрамкі папулярнай музыкі на мяжы XX – пачатку XXI ст. | | 2 |
| *Тэма 5.* Зараджэнне і развіццё рок-музыкі (другая палова XX ст.) | 2 | |
| *Тэма 6.* Стылёвыя напрамкі рок-музыкі | | 2 |
| *Тэма 7.* Развіццё эстраднай музыкі ў Расіі | 2 | 1 |
| *Тэма 8.* Рок-музыка ў Расіі | | 1 |
| *Тэма 9.* Развіццё эстраднай музыкі ў Беларусі | 2 | 2 |
| *Тэма 10.* Рок-музыка ў Беларусі | | 1 |
| Усяго… | 12 | 14 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## *Уводзіны*

Месца і роля дысцыпліны «Гісторыя сусветнага і беларускага эстраднага музычнага мастацтва» ў падрыхтоўцы спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі ў сферы мастацтва эстрады. Узаемасувязі з іншымі раздзеламі вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя мастацтва эстрады», са спецыяльнымі і прафілюючымі дысцыплінамі напрамкаў спецыяльнасці «Мастацтва эстрады» – «Інструментальная музыка», «Спевы», «Камп'ютарная музыка».

Мэта і задачы дысцыпліны. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Формы самастойнай работы студэнтаў.

Паняцце «эстрада». Шырокае разуменне паняцця «эстрадная музыка» (уключэнне джазавай, рок- і поп-музыкі), змыканне яго з паняццем «лёгкая музыка». Сучаснае азначэнне паняцця «шоу-бізнес». Паняцце «папулярная музыка» як агульнаўжывальнае ў сусветнай практыцы.

## Тэма 1. Вытокі і этапы развіцця эстраднага музычнага мастацтва (да XIX ст.)

Вытокі эстраднага музычнага мастацтва. Наяўнасць элементаў эстрады ў антычным «нізавым» тэатры, жанрах міма, пантаміма, рымскай атэлане, творчасці акрабатаў, жанглёраў, танцоўшчыц, гістрыёнаў.

Творчасць сярэдневяковых трубадураў і менестрэляў. Першыя ўзоры масавай папулярнай музыкі ў мастацтве тагачасных жанглёраў. Даступнасць яе блізкай да фальклору музычнай мовы. Наяўнасць тэхнікі «аранжыроўшчыка».

З'яўленне мноства «песеннікаў» і зборнікаў танцавальнай музыкі ў эпоху Адраджэння. Шырокае распаўсюджанне «вулічнай музыкі» (серэнады, касацыі і інш.), «начной музыкі» (баркаролы) на поўдні Еўропы.

Пачатак дзейнасці першых музычных выдавецкіх фірм у XVI ст. Увага танцавальна-бытавым (зборнік «Англійскі настаўнік танцаў» («The English Dancing Master», 1650 г., выдадзены Д. Плэйфардам) і народна-песенным жанрам. Развіццё танцавальна-бытавой музыкі (танцавальныя сюіты для святаў і баляў) у XVII ст. Салоннае музыцыраванне ў XVIII ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распаўсюджанне ў XVIII–XIX стст. мюзік-холаў, кафэшантанаў, кабарэ, вар’етэ, канцэртная праграма якіх складаецца з кароткіх п’ес, спеваў, танцаў, буфонных інтэрмедый, пародый і канферанса.

## Тэма 2. Этапы развіцця эстраднага музычнага мастацтва (XIX – пачатак XXI ст.)

Законы рынку як вызначальны фактар музычнага жыцця грамадства ў XIX ст. Функцыянаванне выдавецкіх фірм і антрэпрэнёраў. Фарміраванне «лёгкажанравай» сферы ў другой палове XIX ст.

Англія – першая краіна, у якой зацвердзіліся камерцыйныя падыходы ў сферы мастацтва. Практыка дэмакратычнага асяроддзя («нізоў») – аснова музычнага жыцця Англіі і яе паўночных калоній з канца XVII да XIX ст. Музыка англійскіх менестрэляў. «Опера жабрака» («The Beggar’s Opera») Д. Гея – правобраз будучага музычнага тэатра Англіі. Узнікненне мюзік-хола. Падпарадкаванне middle class (буржуазія) культуры ўсіх сацыяльных пластоў.

Асобая мастацкая атмасфера ЗША, уплыў пурытантызму. Сінтэз еўрапейскага і нееўрапейскага музычных строяў у амерыканскай музыцы. Развіццё «нізавых» балаганных форм адпачынку. Распаўсюджанне еўрапейскай (англійскай) аперэты і фарміраванне нацыянальнага тэатра менестрэляў у другой палове XIX ст. Зараджэнне джаза. Параджэнне самастойнай «індустрыі адпачынку». Узнікненне «брадвейскай музычнай камедыі» і мюзікла ў пачатку XX ст.

Актыўнае развіццё ў XX ст. асаблівай вобласці музычнай творчасці – эстраднай музыкі.

## Тэма 3. Стылёвыя напрамкі папулярнай музыкі XX ст.

Напрамкі папулярнай музыкі XX ст. Сінтэз заходнееўрапейскай, міжземнаморскай, афрыканскай, індзейскай, паўднёва-ўсходняй азіяцкай музычных культур у Новым Свеце.

*Соўл* як стыль амерыканскай папулярнай музыкі другой паловы 1950-х гг. Вытокі стылю. Характэрныя рысы соўл (сярдэчнасць, страснасць, меладычная і рытмічная насычанасць, ярка выражанае сінкапіраванне). Творчасць Рэя Чарльза і Сэма Кука.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Фанк* як амерыканскі выканальніцкі стыль другой паловы 1950-х гг. Характэрныя рысы фанка (блюзавае інтанаванне, тэндэнцыя да істотнага адхілення ад тэмперыраванага строю, экспрэсіўная манера голасавядзення, танцавальны рытм, скразное сінкапіраванне, экстатычнасць). Творчасць Джэймса Браўна і групы «Sly and the Family Stone».

*Рэгей (рэгі)* – ямайскі музычны стыль канца 1960-х гг. Вытокі стылю. Асіміляцыя рэгей поп- і рок-музыкай у 1970-я гг. Характэрныя рысы рэгей (складаная рытміка з прымяненнем поліррытміі і поліметрыі, прынцыпу рэгулярнага сінкапіравання, выкарыстанне разнастайных ударных інструментаў, двухтактная перыядычнасць меладычных і гарманічных структур, антыфонны прынцып як аснова формаўтварэння).

*Хіп-хоп (рэп)* як стыль амерыканскай танцавальнай музыкі 1970-х гг. Вытокі стылю. Аб’яднанне хіп-хопа з традыцыяй імправізаванай вулічнай паэзіі (рэп) амерыканскіх гарадскіх гета: рытмічнае прагаворванне розных фраз на фанаграму з танцавальным рытмам. Уздзеянне рэпа на поп-музыку. Творчасць DJ Hollywood, Кула Хёрка, Грэндмасцера Флэша, Курціса Блоу.

*Дыска* як стыль танцавальнай музыкі, распаўсюджаны ў ЗША і краінах Еўропы ў сярэдзіне 1970-х гг. Музычная аснова дыска. Асіміляцыя дыска афрыканскіх і лацінаамерыканскіх рытмаў (1990-е гг.). Характэрныя рысы стылю (простыя мелодыі і тэксты, аднастайны рытм, шырокае выкарыстанне сінтэзатарных эфектаў, «інструменталізацыя» вакалу). Творчасць Доны Самер, груп «ABBA», «Boney M».

## Тэма 4. Стылёвыя напрамкі папулярнай музыкі на мяжы XX – пачатку XXI ст.

Напрамкі папулярнай музыкі канца XX – пачатку XXI ст.

*Ф’южн* як сучасны стылёвы напрамак, сінтэз джаз-рока, элементаў еўрапейскай акадэмічнай музыкі і нееўрапейскага фальклору. Творчасць Чыка Карыа.

*Брыт-поп* як стыль поп-музыкі 1990-х гг. Асіміляцыя і крытычнае пераасэнсаванне ў брыт-попе ўсіх дасягненняў папярэдняй масавай музычнай культуры. Творчасць групы «Oasis».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіццё *электроннай музыкі* ў канцы XX – пачатку XXI ст. Творчасць Жана-Мішэля Жара, Клауса Шульцэ, Рона Бутца, Браяна Іна, Масіма Магрыні, груп «Kraftwerk», «Tangerine Dream», «Space».

Творчасць вядомых выканаўцаў сучаснай папулярнай музыкі: Чака Беры, Джорджа Бэнсана, Фрэнка Сінатры, Элвіса Прэслі, Прынса, Ціны Цёрнер, Боба Дзілана, Майкла Болтана, Лені Кравіца, Мадоны, Сціві Уандэра, Уітні Х'юстан, Майкла Джэксана, Шэр, Крысціны Агілеры (ЗША); Леанарда Коэна, Браяна Адамса (Канада); Элтана Джона, Джо Кокера, Крыса Ры, Джорджа Майкла, Тома Джонса, Озі Осбарна, Сцінга (Англія); Эдзіт Піаф, Шарля Азнавура, Джо Дасэна, Мірэй Мацьё, Патрысіі Каас, Селін Дыён (Францыя); Адрыяна Чэлентана, Джані Марандзі, Рафаэлы Кара, Аль Бана (Італія), Энрыке Іглесіаса (Іспанія) і інш.

## Тэма 5. Зараджэнне і развіццё рок-музыкі (другая палова XX ст.)

Рок-музыка як сацыякультурны феномен і з'ява музычнага мастацтва. Музычныя, сацыяльныя і тэхналагічныя перадумовы ўзнікнення рок-музыкі.

Стылёвая аснова рок-музыкі: рытм-энд-блюз, рок-н-рол, кантры-энд-вестэрн. *Рытм-энд-блюз* як інструментальны стыль негрыцянскай музыкі 1930-х гг. *Рок-н-рол* як стыль папулярнай музыкі 1950-х – першай паловы 1960-х гг. Характэрныя рысы рок-н-рола (выкарыстанне блюза дванадцаці тактаў у якасці структурнай асновы, тэхніка рыфаў, экспрэсіўная манера выканання, элементарны паэтычны тэкст, танцавальная аснова). *Кантры-энд-вестэрн* як стылёвы напрамак пачатку XX ст., які склаўся ў выніку спалучэння архаічных форм музычнага фальклору белага насельніцтва паўднёва-ўсходніх і заходніх рэгіёнаў ЗША. Характэрныя рысы кантры-энд-вестэрна (простыя меладычныя і гарманічныя структуры, інструментальнае гучанне, лірычныя, жартоўныя, патрыятычныя тэксты).

Этапы развіцця рок-музыкі: 1) 1950-я гг. – фарміраванне рока як музычнага напрамку на аснове рытм-энд-блюза, рок-н-рола, кантры-энд-вестэрна; 2) 1960–1967 гг. – узнікненне і развіццё брытанскай рок-музыкі; 3) 1967 г. – канец 1970-х гг. – дзяленне рок-музыкі на мноства стылёвых напрамкаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(джаз-рок, фолк-рок, арт-рок, хард-рок, панк-рок і інш.); 4) 1980-я пачатак 2000-х гг. – узаемадзеянне рок-музыкі з рознымі музычнымі стылямі.

Характэрныя рысы рок-музыкі (роля рытму, тэхніка рыфаў, надрыўны вакал, яркія меладычныя лініі рок-кампазіцый, арганічнае спалучэнне музыкі з паэзіяй (рок-паэзія), тэатралізацыя дзеяння (рок-шоу), удзел слухачоў у працэсе выканання кампазіцый).

## Тэма 6. Стылёвыя напрамкі рок-музыкі

Брытанскі *біг-біт* і яго прадстаўнікі. Творчасць ансамбля «Beatles». Англійскі і амерыканскі *фолк-рок*. Творчасць Боба Дзілана.

*Арт-рок*. Творчасць груп «Pink Floid», «King Crimson», «Yes», трыа «ELP».

Прадстаўнікі амерыканскага *панк-рока:* Ігі Поп і група «Stooges». «Другое прышэсце» панк-рока ў Вялікабрытаніі. Творчасць груп «Sex Pistols» і «Clash». Музыка *«новай хвалі»* як вынік сімбіёзу дыска і панк-рока. *Пост-панк* і *хардкор* як апошнія ступені развіцця панк-рока.

Грандж як вынік сінтэзу традыцый панк-рока і «цяжкіх» разнавіднасцей рока. Творчасць групы «Nirvana».

Амерыканскі *джаз-рок* (ф’южн) і яго прадстаўнікі. Творчасць груп «Chicago» и «Whither report».

Американский *псіхадэлічны рок*. Творчасць груп «Doors» і «Velvet undergground».

Прадстаўнікі *блюз-рока*. Творчасць Джымі Хендрыкса і Джэніс Джоплін.

Брытанскі *хард-рок* і яго прадстаўнікі. Творчасць груп «Deep purple» і «Led Zeppelin». Трансфармацыя хард-рока ў *хэві-метал*. Дзяленне хэві-метал на шэраг адгалінаванняў (трэш-метал, спід-метал, уайт-метал, блэк-метал, дэз-метал, дум-метал, гоцік-метал).

*Рок-авангард* як вынік зліцця рока, джаза, фальклору і акадэмічных жанраў.

## Тэма 7. Развіццё эстраднай музыкі ў Расіі

Сялянскі і гарадскі фальклор, народныя балаганы, тэатральныя дывертысменты, музычныя вечары ў арыстакратыч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных салонах, літаратурныя чытанні, канцэрты ў клубах і г.д. як крыніцы ўзнікнення эстрады ў Расіі.

Фарміраванне рускай эстрады ў другой палове XIX ст. Актыўнае перайманне складзеных на Захадзе форм забаўляльнага мастацтва ў сярэдзіне XIX ст. (бульварныя тэатры, садова-паркавыя «адкрытыя сцэны», кафэ-канцэрты (кафэшантаны), вар'етэ, кабарэ і г.д. Роля рускага гарадскога рамансa ў развіцці расійскай эстрады. Спалучэнне ў рамансе традыцый рускай народнай і цыганскай песні, вакальнай мініяцюры заходнееўрапейскіх кампазітараў. Пашырэнне сферы ўжывання тэрміна «эстрада» ў Расіі ў пачатку XX ст., выкарыстанне яго ў азначэнні «зборных» канцэртаў, складзеных з асобных нумароў музычнага, харэаграфічнага, тэатральнага, цыркавога відаў мастацтва.

Этапы развіцця эстраднай музыкі ў Расіі. Руская савецкая эстрада 1917–1950-х гг. Агітацыйныя тэатры, тэрэўсаты. Стварэнне савецкай аперэты. Дзейнасць Л.Уцёсава. Франтавыя эстрадныя брыгады.

Расійская эстрада другой паловы XX – пачатку XXI ст. Ленінградская і маскоўская эстрадныя школы. Развіццё расійскай эстраднай песні ў 1970 – пачатак 2000-х гг. Творчасць кампазітараў Ю. Антонава, В. Дабрыніна, Р. Паўлса, Д. Тухманава, У. Шаінскага, І. Якушэнкі. «Электра-поп» як эквівалент «еўра-дыска» (творчасць груп «Мираж», «Ласковый май», «Твой день»). Расійскі шансон. Сацыякультурныя і эстэтычныя перадумовы ўзнікнення аўтарскай песні. Творчасць Б. Акуджавы, У. Высоцкага, А. Галіча, Ю. Візбара, А. Гарадніцкага, А. Дулава, Я. Клячкіна. Электронная музыка (Э. Арцем'еў, групы «Зодиак» («Zodiaks»), «Новая коллекция»).

## Тэма 8. Рок-музыка ў Расіі

Узнікненне *вакальна-інструментальных груп* (ВІА) як водгук на брытанскі біг-біт («Поющие гитары», «Веселые ребята», «Добры молодцы», «Самоцветы», «Цветы»). Зліццё элементаў фальклору і сучасных рытмаў у творчасці ВІА «Ариэль», «Ялла», «Гюнеш», «Лайме», «Модо».

Першыя *незалежныя* савецкія рок-групы. *Бард-рок* («тэкст-рок») і яго прадстаўнікі. Творчасць А. Макарэвіча («Машина времени»), А. Раманава і К. Нікольскага («Воскресение»), С. Рыжэнкі і В. Шчукіна («Последний шанс»), Б. Грэбеньшчыкова («Аквариум»), А. Башлачова.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Арт-рок* і яго прадстаўнікі (песенны цыкл Д. Тухманава «По волне моей памяти»). Першыя савецкія *рок-оперы*. Узнікненне *фолк-рока* (сюіта А. Градскага «Русские песни», творчасць групы «Автограф»). Расійскі *хард-рок* і *хэві-метал* («99%», «Черный кофе», «Ария», «Круиз», «Мастер»). *Авангард-рок* і яго прадстаўнікі («Странные игры»).

Камерцыялізацыя і «рэгіяналізацыя» (ленінградскі рок-н-рол, маскоўскі рок, свярдлоўскі рок, уладрок (Уладзівасток)) расійскага рока. Фарміраванне андэграўнда. *Панк-рок* («Гражданская оборона», «БОМЖ»). *Фолк-рок* («Калинов мост»). *Рытм-энд-блюз* («Принцип неопределенности»). Творчасць Земфиры, груп «Мумий Тролль», «МультFильмы», «Сплин», «Би-2»).

## Тэма 9. Развіццё эстраднай музыкі ў Беларусі

Фарміраванне эстраднай музыкі Беларусі ў рэчышчы развіцця расійскай эстрады. Актыўнае пашырэнне ў Беларусі ў 1960-х гг. эстраднай песні як найбольш запатрабаванага жанру папулярнай музыкі. Праца кампазітараў-песеннікаў І. Лучанка, Э. Ханка, Э. Зарыцкага, І. Капланава, В. Іванова, Л. Захлеўнага, У. Будніка, У. Дамарацкага, У. Кандрусевіча і інш. Вылучэнне плеяды эстрадных выканаўцаў – Н. Багуслаўскай, В. Вуячыча, Т. Раеўскай, В. Шутавай і інш.

Распаўсюджанне руху аматарскіх вакальна-інструментальных ансамбляў (ВІА) у 1960–1970-х гг. Першыя прафесійныя ВІА («Тоніка» – 1968, пад кіраўніцтвам Ю.Антонава; «Лявоны» – 1969, з 1970 «Песняры», пад кіраўніцтвам У.Мулявіна; 1970-я – «Купалінка», «Чараўніцы», «Верасы», «Сябры»). Творчасць кампазітараў-аматараў У. Мулявіна, В. Раінчыка.

Шырокі спектр стылёвых напрамкаў у сучаснай беларускай эстраднай песні. Збліжэнне беларускай эстраднай песні з танцавальнай музыкай у пачатку 1990-х гг. (І. Афанасьева, І. Дарафеева, Л. Ялінская, І. Абалян). Беларускае дыска (С. Мінскі, С. Сухамлін, дуэт «Анжэліка»). Беларускі хіп-хоп (рэп) («Бі-стрым», «Дыскаверы», «Кропка адліку»). Прадстаўнікі «традыцыйнай» эстраднай песні (Я. Навуменка, дуэт Я. Паплаўская і А. Ціхановіч, В. Дайнека); так званай «шансоннай лірыкі» (А. Саладуха, У. Ухцінскі, С. Герасімаў).

Дзейнасць Нацыянальнага канцэртнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі пад кіраўніцтвам М. Фінберга як па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пулярызатара беларускага эстраднага мастацтва. Арганізацыя шматлікіх міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў.

Развіццё электроннай музыкі ў Беларусі. Творчасць групы «Салярыс». Клубная музыка.

## Тэма 10. Рок-музыка ў Беларусі

Этапы развіцця рок-музыкі ў Беларусі. Зараджэнне рок-музыкі ў канцы 1960-х гг. «Лявоны» («Песняры») як першы прафесійны беларускі калектыў, які магчыма класіфікаваць як ВІА (імкненне да поп-музыкі) і ў меншай ступені як рок-групу (наяўнасць некаторых элементаў стылістыкі рока ў музычнай мове ансамбля). Аснова рэпертуару «Песняроў» (папулярныя песні савецкіх кампазітараў, апрацоўкі фальклору, арыгінальныя песні, аўтарскія рок-кампазіцыі). Ансамбль «Песняры» як заснавальнік *арт-року* (рок-балады У. Мулявіна «Ванька-встанька» на вершы Я. Еўтушэнкі, «Крик птицы» на вершы Ю.Рыбчынскага) і *фолк-року* ў Беларусі. Звароттанне У. Мулявіна да жанру *оперы-прытчы* («Песня пра долю» па матывах «Адвечнай паэмы» Я.Купалы). Старажытныя беларускія абрадавыя песні як музычная аснова оперы.

Фарміраванне беларускай нацыянальнай рок-музыкі ў пачатку 1980-х гг. Першая беларуская рок-група «Сузор'е» (1977). Арыентацыя на *хард-рок*, эксперыменты з «буйнымі формамі» (сюіта У. Будніка «На шляху дзікіх гусей» на вершы М. Танка, ідэя *рок-паэмы* «Песня пра зубра» М. Гусоўскага). З'яўленне новых беларускіх рок-груп «Бонда» і «Мроя» (з 1994 – «N.R.M.» (Незалежная Рэспубліка Мроя)) у сярэдзіне 1980-х гг. Фарміраванне беларускіх традыцый нонканфармізму ў рок-музыцы.

Інтэнсіўнае развіццё беларускага рока з пачатку 1990-х гг. Тыповыя прадстаўнікі: «Крама», «N.R.M.», «Нейра-дзюбель», «Новае неба», «Экзіст» (Мінск), «Gateward», «Сцяна» (Брэст), «Анархайзіс» (Столін), «Дзівейшн» (Гродна), «ТТ-34» (Гомель), «АвангардШкола» (Магілёў) і інш. Найбольш папулярныя сучасныя праекты беларускіх музыкантаў *(поп-рок)* – групы «J:Морс», «beZ bileta», «Харлі», «Naka», «Indiga» і інш. Сучасныя прадстаўнікі *фолк-року:* групы «Троіца», «Юр'я», «Postscriptum», «Ліцьвіны», «Зелень дарог», «Znich», «Зьмяя», «Нагуаль», «Яр», «Стары Ольса», дуэт «Аляксандра і Канстанцін».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Акопян, Л.* Музыка XX века: энцикл. словарь / Л. Акопян. – М.: Практика, 2010. – 85 с.

2. *Алексеев, А. С.* Энциклопедия российской поп- и рок-музыки: кто есть кто / А. Алексеев, А. Бурлака. – М.: ЭКСМО-Пресс, 2001. – 431 с.: ил.

3. *Клитин, С.* История искусства эстрады / С. Клитин. – М.: Изд. Е. С. Алексеева, 2008. – 448 с.

4. *Козлов, А. С.* Рок глазами джазмена / А. С. Козлов. – М.: Городец, 2008. – 261 с.: ил.

5. *Конен, В. Д.* Третий пласт: новые массовые жанры в музыке XX века / В. Д. Конен. – М.: Музыка, 1994. – 160 с.

6. *Королёв, О. К.* Краткий энциклопедический словарь джаза, рок- и поп-музыки. Термины и понятия / О. К. Королёв. – М.: Музыка, 2006. – 168 с.

7. *МакДермот, А.* Лирическая рок-энциклопедия / А. МакДермот; пер. с англ. А. Кутинова. – М.: Инфосерв, 1993. – 192 с.

8. *Мархасёв, Л.* XX век в легком жанре (Взгляд из Петербурга – Петрограда – Ленинграда): хронограф музыкальной эстрады 1900–1980-х годов / Л. Мархасёв. – СПб.: Композитор, 2006. – 504 с.

9. *Музыкальный* словарь Д. Гроува / Д. Гроув; пер. с англ., ред. и дополн. Л. О. Акопяна. – М.: Практика, 2001.– 1095 с.

10. *Сыров, В.* Стилевые метаморфозы рока / В. Сыров. – СПб.: Композитор, 2008. – 312 с.: нот.

11. *Шостак, Г. В.* Массовые музыкальные жанры XX века в контексте мировой художественной культуры [Электронный ресурс] / Г. В. Шостак. – URL: http://shostak.iatp.by.

12. *Эстрада* в России. XX век. Лексикон / отв. ред. Е. Д. Уварова. – М.: РОССПЭН, 2000. – 784 с., ил.

*Дадатковая*

1. *Акимов, В. В.* Леонид Утесов / В. Акимов. – М.: АСТ: Олимп, 1999. – 441 с.: ил.

2. *Бегишева, Л. В.* Я говорю со звездами. О российских звездах сцены / Л.В. Бегишева. – М.: Маркетинг, 1996. – 96 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Бенсон, Р.* Пол Маккартни: личность и миф / Р. Бенсон. – М.: Новости, 1993. – 320 с.

4. *Берто, С.* Эдит Пиаф: воспоминания / С. Берто. – СПб.: Северо-Запад, 1994. – 478 с.

5. *Бондаренко, В. В.* Энциклопедия популярной музыки / В. В. Бондаренко, Ю.В. Дроздов. – Минск: Экономпресс, 2001.

6. *Верморел, Ф.* Секс Пистолз: история изнутри: пер. с анг. / Фред и Джуди Верморел. – СПб., 1994. – 271 с.

7. *Винер, Дж.* Вместе! Джон Леннон и его время: пер. с анг. / Дж. Винер. – М.: Радуга, 1994. – 302 с.

8. *Владимир* Мулявин. Нота судьбы: воспоминания, интервью, исследования / ред.-сост. Л. Крушинская. – Минск: Маст. літ., 2004. – 446 с.: ил.

9. *Готовцев, Л. И.* Правда о шоу-бизнесе / Л. И. Готовцев. – М.: РИПОЛ классик, 2004. – 364 с.: ил.

10. *Гребенщиков, Б. Б.* Не песни / Б. Б. Гребенщиков. – Тверь: ЛЕАН, 1997. – 190 с.: ил.

11. *Джексон, Л. Т.* Майкл Джексон глазами его сестры / Л. Т. Джексон. – СПб.: Лейла, 1993. – 384 с.

12. *Дидуров, А.* Солдаты русского рока: очерки / А. Диуров. – М.: Русь-90, 1994. – 192 с.

13. *Дэвис, Х.* Битлз: авториз. биогр. / Х. Дэвис; послесл. А. В. Макаревича. – М.: Радуга, 1993. – 416 с.

14. *Золотое* подполье: полн. иллюстр. энцикл. рок-самиздата, 1967–1994: История. Антология. Библиография / авт. и сост. А. Кушнир. – Нижний Новгород: Деком, 1994. – 367 с.

15. *Коваленко, С. Б.* Современные музыканты: поп, рок, джаз / С. Б. Коваленко. – М.: РИПОЛ классик, 2002. – 605 с.

16. *Константин* Кинчев: жизнь и творчество. Стихи. Документы. Публикации / авт.-сост. Н. Барановская. – СПб.: Новый Геликон: ТОК, 1993. – 239 с.

17. *Локиер, Д.* Хулио Иглесиас: неспетая песня / Д. Локиер; пер. с англ. Т. Н. Замиловой. – Смоленск: Русич, 1998. – 409 с.: ил.

18. *Маббетт, Э.* Пинк Флойд: путеводитель / Э. Маббетт; пер. С. Резаева. – М.: Локид, 1997. – 190 с.: ил.

19. *Макарова, Н. Е.* Алла Пугачева / Н. Е. Макарова. – Минск: Литература, 1998. – 254 с.

20. *Мартыненка, В.* 222 альбомы беларускага року і ня толькі...: праз рок-прызму / В. Мартыненка, А. Мяльгуй. – Мінск: Медысонт, 2006. – 431 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

21. *Панасов, И. В.* Шоу-бизнес / И. В. Панасов. – М.: ЭКСМО; Донецк: Скиф, 2004. – 380 с.

22. *Певцы* советской эстрады / сост. М. В. Успенская. – М.: Искусство, 1992. – Вып. 3. – 302 с.

23. *Популярная* энциклопедия звезд: на пике славы и скандала / Ф. Раззаков. – М.: ЭКСМО-Пресс: ЭКСМО-Маркет, 2000. – 687 с.: ил.

24. *Развлекательное* искусство в социокультурном пространстве 1990-х годов: сб. ст. / Рос. акад. наук; Министерство культуры Рос. Федерации; Гос. ин-т искусствознания. – СПб.: Дмитрий Буланин, 2004. – 208 с.

25. *Резник, И. Р.* Алла Пугачева и другие: воспоминания, стихи, песни, эпиграммы, посвящения / И. Р. Резник. – М.: Олма-пресс, 2001. – 383 с.

26. *Рок-справочник:* путеводитель в мире зарубежной рок-музыки / сост. В. И. Василевский. – Новосибирск: Издатель, 1992. – 340 с.

27. *Рок-энциклопедия* / авт. и сост. С. Кастальский. – М.: Ровесник, 1997. – 909 с.

28. *Савченко, Б. А.* Кумиры российской эстрады / Б. А. Савченко. – М.: Панорама, 1998. – 430 с.: ил.

29. *Скай, Р.* Фредди Меркьюри: повесть: пер. с анг. / Р. Скай. – М.: Мирт, 1993. – 208 с.

30. *Скирюк, Д.* Другой rock-and-roll: [эссе] / Д. Скирюк. – М.: Азбука-классика, 2008. – 366 с.

31. *Скороходов, Г. А.* Звёзды советской эстрады: очерки об эстрад. певцах, исполнителях сов. лирической песни / Г. А. Скороходов. – 2-е изд., испр., доп. – М.: Сов. композитор, 1989. – 184 с., фот.

32. *Утёсов, Л. О.* Спасибо, сердце! / Л. О. Утёсов. – М.: Вагриус, 2000. – 363 с.

33. *Федоров, О.* Deep Purple: от «Оттенков пурпура» до осколков «Метеора» / О. Федоров. – СПб.: Петроарт, 1993. – 192 с.

34. *Хоугэн, П. К.* Куин: путеводитель: пер. с анг. / П. Хоугэн. – М.: Локид, 1997. – 170 с.:ил.

35. *Шоу-бизнес* Беларуси, 2003 / сост. А. Вашкевич [и др.]. – Минск: Логвинов: Новая музык.: Политика, 2003. – 104 с.

36. *History* of electronic and computer music including automatic instruments and composition machines / Dr. Kristine H. Burns // Dartmouth Electro-acoustic Music Program [Electro-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

nic resource]. – Mode of access: http://eamusic.dartmouth.edu/~wowem/electronmedia/music/eamhistory.html. – Date of access: 1.09.2007.

*37. Nautilus* Pompilius: введение в наутилусоведение / Л. Порохня [и др.]. – М.: Терра, 1997. – 381 с.:ил.

*38. Popular* music // The World Book Encyclopedia (International). – London, Sydney, Tunbridge, Wells, Chicago: World Book Inc., 1992, 1993, 1994. – Vol. 15. – P. 682–684.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВА ЭСТРАДЫ**
**Раздзел 1. Гісторыя сусветнага і беларускага эстраднага музычнага мастацтва**

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках)*

Рэдактар В. В. Каташвілі
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60х84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,05. Ул.-выд. арк. 0,69.
Тыраж экз. Заказ .

УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ